*С.В.ЗЫГМАНТОВІЧ*

# МАТЫВАЦЫЙНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ НА БЕСПЕРАПЫННУЮ АДУКАЦЫЮ

*У артыкуле раскрываюцца вынікі сацыялагічнага даследавання аб матывах выбару прафесіі бібліятэкара выпускнікамі агульнаадукацыйных школ, матывацыйнай накіраванасці будучых бібліятэкараў на паслядыпломную адукацыю. Даюцца рэкамендацыі аб паляпшэнні прафарыентацыйнай работы і адбору абітурыентаў, удасканаленні выкладання спецыяльных дысцыплін, павышэнні іміджу прафесіі бібліятэкара ў грамадстве.*

Аналіз шырокага кола даследаванняў, праведзеных навукова-даследчымі інстытутамі ў галіне адукацыі, паказваюць, што эфектыўнасць прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай адукацыі цесна звязана з сацыяльна-псіхалагічнымі ўстаноўкамі асобы на выбар і атрыманне будучай прафесіі, авалоданне прафесіяй у сценах навучальнай установы, а таксама на ўдасканаленне ў галіне абранай спецыяльнасці [1–4].

Матывацыя з'яўляецца тым своеасаблівым псіхалагічным механізмам, з дапамогай якога фарміруюцца асноўныя жыццёвыя адносіны асобы да працы, людзей, сферы пазнання. Матывацыя азначае абгрунтаванне, аргументацыю выбару ўчынка, практычнага дзеяння. Дзякуючы матывацыі патрэбнасць чалавека пераўтвараецца ў ідэальную форму інтарэсу – асэнсаваныя патрэбнасці, сродкі і спосабы іх задавальнення, на чым ён засяроджвае сваю ўвагу. Зрабіўшыся ўстойлівымі, пастаянна дзеючымі, інтарэсы пераўтвараюцца ў жыццёвую патрэбнасць [5].

Мэта дадзенага артыкула – засяродзіць увагу на некаторых аспектах матывацыі выбару будучымі бібліятэкарамі сваёй прафесійнай дзейнасці і пытаннях фарміравання ў студэнтаў матывацыйнай накіраванасці на бесперапынную адукацыю. У спецыяльным бібліятэчным друку гэтым пытанням прысвечана невялікая колькасць артыкулаў, падрыхтаваных у асноўным на аснове вопыту работы расійскіх навучальных устаноў і канкрэтных аднаразовых даследаванняў [6–9].

Матывацыя выбару прафесіі і далейшае прафесійнае станаўленне асобы цесна звязаны з прафесійнай самасвядомасцю, якая разглядаецца як кампанент цэласнай самасвядомасці асобы, як суб'ектыўная аснова выбару прафесіі, ацэнка асобай сваіх магчымасцей, схільнасцей, здольнасцей і іх адпаведнасці патрабаванням прафесіі. Яе змест складаюць адносіны да сябе як суб'екта ўласнай, а ў дачыненні да школьнікаў – будучай прафесійнай дзейнасці. Яны развіваюцца і рэалізуюцца ў працэсе ўзаемадзеяння індывіда і навакольнага асяроддзя. Апошняе праяўляецца ў назапашванні ведаў аб прафесіях [10]. Такім чынам, важнейшым фактарам прафесійнага самавызначэння выступае ўзровень інфармаванасці вучня аб прафесіях і аб сабе.

Цікавымі з'яўляюцца вынікі даследаванняў, якія праводзіліся ў Нацыянальным інстытуце адукацыі Рэспублікі Беларусь. Высветлілася, што сучасныя выпускнікі сярэдняй агульнаадукацыйнай школы мала ведаюць аб прафесіях, з якіх трэба выбіраць уласную, большасць з іх не змаглі даць характарыстыку выбранай прафесіі па чатырох класіфікацыйных прыметах – прадмет, мэта, прылады, умовы працы. Толькі трэцяя частка апытаных назвалі 2–3 якасці, неабходныя для паспяховай прафесійнай дзейнасці. Пытанне аб тым, якія патрабаванні прад'яўляе выбраная прафесія да асобасных якасцей чалавека, стану яго здароўя, у асноўным засталося без адказу. Прыярытэт аддадзены прафесіям урача, мытніка, юрыста, прадаўца, бармена, эканаміста. Астатнія прафесіі называліся ў адзінкавых выпадках. 70% апытаных лічаць, што выбраная прафесія ў найбольшай ступені адпавядае іх схільнасцям і здольнасцям, 55 – называюць яе сваім прызваннем, 45 – выбралі яе з-за прэстыжнасці, 32 – адзначылі высокую аплату працы, 28 – магчымасць прафесійнага росту, 13% – патрэбы горада ў кадрах [11].

Якія ж матывы выбару прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа? Даследаванне праводзілася ў 2003/04 навучальным годзе.

З апытаных студэнтаў першага і пятага курсаў стацыянара факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў (агульная колькасць – 101 чалавек) для 22% выбар прафесіі быў выпадковым, для 48% – выкліканы неабходнасцю атрымання вышэйшай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыі, для 5% – зроблены бацькамі, толькі для 19% ён быў асэнсаваным і мэтанакіраваным, з іх для 8% – вызначаўся сямейнымі традыцыямі.

Сярод тых, хто паўплываў на выбар прафесіі, большы працэнт складаюць бацькі – 17 %, супрацоўнікі бібліятэк – 7 %, школа, настаўнікі – 1 %.

Псіхолагі вылучаюць тры тыпы існуючай прафесійнай матывацыі:

– дамінантны – каштоўнасныя арыентацыі звязаны з рэальнымі даврафесійнымі паводзінамі асобы, гэта значыць маюцца устойлівая цікавасць да прафесіі, захапленне прафесіяй, любоў да літаратуры, камунікатыўныя здольнасці, імкненне да дадзенага віду дзейнасці і інш. Так, аналізуючы адказы нашых рэспандэнтаў, мы знаходзім такую прычыну выбару прафесіі, як любоў да літаратуры і жаданне працаваць з кнігай. Адна студэнтка напісала: ”Мая маці працуе ў бібліятэцы шмат гадоў. Я часта бывала ў яе на працы, назірала за яе паводзінамі, за тым, як яна абслугоўвае чытачоў. Мяне захапляла заўжды тая атмасфера, якую яна стварыла ў бібліятэцы. Я хачу стаць падобнай да маці і, як і яна, прыносіць чытачам карысць і радасць”;

– сітуатыўны – тут, як правіла, выяўляецца прыярытэтны ўплыў пэўных жыццёвых абставін пры выбары прафесіі, якія не суадносяцца з каштоўнаснымі арыентацыямі асобы. Сярод адказаў студэнтаў часта сустракаюцца такія: “Я баюся матэматыкі, а на бібліятэчным факультэце гэтага прадмета няма”; “Не паступіла, куды хацела, а потым, каб не губляць часу, было ўсё роўна, дзе вучыцца”; “Усё жыццё хацела працаваць настаўнікам, але пабаялася паступаць у педуніверсітэт”;

– канфармісцкі – у адпаведнасці з гэтым тыпам матывацыі адбываецца такое ўзаемадзеянне з групай або з пэўнымі асобамі, у выніку якога адвольна (без крытычнага аналізу) змяняецца матывацыя: выбар прафесіі ажыццяўляецца з рознай ступенню добраахвотнасці (калі-нікалі па прымушэнні), што звязана з высокім узроўнем трывожнасці асобы, няўпэўненасцю ў сабе, сваіх здольнасцях, а таксама з нізкім узроўнем сацыяльнай сталасці. Таму ўзнікаюць нявер’е ва ўласныя сілы і давер да меркаванняў акружаючых, поўная ці частковая ідэнтыфікацыя сваіх матываў з іншымі. У выніку затухаюць унутраныя творчыя працэсы асобы. Пры аналізе сустракаюцца адказы, якія сведчаць аб наяўнасці дадзенага тыпу матывацыі ў студэнтаў: “На мой выбар прафесіі паўплывалі жаданні бацькоў”, “Пайшла паступаць разам з сяброўкай”.

Якасць адукацыі непасрэдна залежыць ад наяўнасці пазітыўнай матывацыі, што прадугледжвае асэнсаванне асобай значнасці для яе атрымання навучання. Псіхолагамі ўстаноўлена, што нават нейтральная матывацыя, не кажучы ўжо аб адмоўнай, блакіруе пазнавальны і адукацыйны працэсы, рэзка зніжае яго эфектыўнасць. А па выніках нашага апытання толькі кожны трэці студэнт мае дамінантны тып прафесійнай матывацыі.

Сярод прывабных бакоў прафесіі бібліятэкара большасць апытаных называюць магчымасць працы з літаратурай, магчымасць атрымання любой інфармацыі – 37 %, 30 % –зносіны з іншымі людзьмі. Многія выпускнікі адзначылі, што прафесія бібліятэкара спрыяе рознабаковаму развіццю, начытанасці (35 %). Сярод прывабных бакоў прафесіі называліся і магчымасці аказаць дапамогу ўласным дзецям у вучобе, пастаяннага самаўдасканалення і інш. Першакурснікі ў ліку прывабных вылучалі ў асноўным два першыя бакі.

Таму выкладчыкі факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый у працэсе навучання павінны фарміраваць і ўмацоўваць станоўчыя адносіны да прафесіі, раскрываць яе сутнасць, фарміраваць станоўчую матывацыю ў адносінах да пазнавальнай прафесійнай дзейнасці.

Менавіта на такі падыход арыентуе і сучасная парадыгма вышэйшай адукацыі, якая разглядае асобаснае развіццё студэнта як фундаментальную аснову яго прафесійнай і жыццёвай самарэалізацыі. Асобасна арыентаваная адукацыя прадугледжвае перанос акцэнту з інфармацыйна-тэхналагічнага на сэнсапошукавае навучанне, на станаўленне пазіцыі, сістэмы адносін будучага прафесіянала з грамадствам, навакольным светам, з самім сабой.

У гэтым плане асаблівую ўвагу трэба надаць рабоце са студэнтамі першага курса, працэсу іх адаптацыі да ўмоў ВНУ. Выкладчыкам неабходна імкнуцца забяспечыць іх прафесійную адаптацыю да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, прыстасаванне да зместу і асобных кампанентаў вучэбнага працэсу, асаблівасцей выбранай прафесіі ў адпаведнасці з асабістымі якасцямі і каштоўнаснымі арыентацыямі; дыдактычную адаптацыю, якая забяспечвае пераемнасць у сістэме “школа–ВНУ”, фарміраванне самастойнасці ў вучэбнай і навуковай рабоце, патрэбнасці ў самакантролі, самаадукацыі і самавыхаванні; сацыяльна-псіхалагічную адаптацыю шляхам фарміравання станоўчых міжасобасных зносін з членамі вучэбнай групы, студэнтамі старшых курсаў і выкладчыкамі факультэта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значную ролю ў рэалізацыі гэтых формаў адаптацыі павінны адыграць курс “Уводзіны ў спецыяльнасць”, прафесійна-выхаваўчая накіраванасць выкладання спецыяльных дысцыплін як на змястоўным, так і працэсуальным узроўнях, выхаваўчая работа куратараў, спецыяльных кафедраў са студэнтамі.

Улічваючы той факт, што ў курсе “Уводзіны ў спецыяльнасць” толькі 2 гадзіны адводзіцца на знаёмства студэнтаў з будучай прафесіяй, мяркуюцца неабходнымі распрацоўка і ўвядзенне ў вучэбны план такога курса, як “Бібліятэчная прафесіялогія”. Гэтая дысцыпліна павінна даць студэнтам комплекснае і глыбокае ўяўленне аб самой навуцы “бібліятэчная прафесіялогія”, а таксама гісторыі бібліятэчнай прафесіі, ролі і месце гэтай прафесіі ў грамадстве ў розныя перыяды, яе сацыяльна-псіхалагічных асаблівасцях, ведах, уменнях, навыках, асабістых якасцях, якія патрабуюцца для бібліятэкара-прафесіянала, аб арыентацыі на прафесію. Значная ўвага пры выкладанні курса можа быць нададзена і пытанням бібліятэчнай прафесіяналізацыі: раскрыццю кірункаў фарміравання бібліятэчнага спецыяліста шляхам розных формаў арганізаванага навучання і паслядыпломнага прафесійнага ўдасканалення, значнасці і шляхам фарміравання прафесійнай свядомасці і самасвядомасці кожнага спецыяліста, магчымасцям дасягнення ў прафесіі майстэрства, высокага прафесіяналізму, творчасці. Важнае месца зоймуць і пытанні прафесійнай культуры бібліятэкара (этычнай, інфармацыйнай, псіхолага-педагагічнай, экалагічнай, прававой, эканамічнай); пытанні функцыянавання прафесійных камунікацый у бібліятэчнай сферы.

Такім чынам, мэта названага курса – фарміраванне ў студэнтаў прафесійнай свядомасці, глыбокага разумення сутнасці, значнасці, нормаў і асаблівасцей бібліятэчнай прафесіі. Курс прадугледжвае не толькі тэарэтычную і практычную падрыхтоўку. Ён накіраваны на кампенсацыю недастатковай інфармаванасці студэнтаў у прафесійным самавызначэнні.

Асаблівасцю бібліятэчнай прафесіі з’яўляецца яе шматфункцыянальнасць. У сувязі з тым, што бібліятэка з’яўляецца своеасаблівай сацыяльна-педагагічнай сістэмай, гэта значыць не толькі дакументнай, а і інфармацыйнай, адукацыйнай, культурна-адпачынкавай, асветнай, а таксама сістэмай абслугоўвання, тэхналагічнай, рэлаксацыйнай, то і бібліятэкар – прафесія шматфункцыянальная, у межах якой вылучаюцца спецыялізацыі, якія адносяцца да прафесій, выдзяляемых як па тыпу “чалавек–знак” (камплектатар, каталагізатар, арганізатар фондаў), так і па тыпу “чалавек–чалавек” (работнік ад- дзела абслугоўвання, менеджэр). Два названыя тыпы могуць і сумяшчацца (бібліёграф, метадыст). А ў сувязі з развіццем аўтаматызацыі бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў спецыялізацыі прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа можна аднесці і да такога тыпу, як “чалавек–машына”. Гэта дае магчымасць студэнту з нявызначанай матывацыйнай накіраванасцю нават у межах адной прафесіі выбраць для сябе спецыялізацыю, якая ў большай ступені адпавядае яго схільнасцям і здольнасцям.

Звярнуўшыся да вынікаў анкетавання студэнтаў 5-га курса, адзначым, што адказы на пытанне: “Якая работа ў бібліятэцы Вас прываблівае?” – сведчаць аб значнай дыферэнцыяцыі выбару студэнтамі сваёй спецыялізацыі. 47% апытанных прываблівае праца, звязаная з абслугоўваннем карыстальнікаў; 33% – масавая работа па абслугоўванні карыстальнікаў; 12% – бібліяграфічная работа; 12% – работа з фондам. Вылучылі студэнты таксама метадычную, навуковую работу, работу па аўтаматызацыі бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў.

Вынікі даследавання прыводзяць таксама да высновы аб неабходнасці перагляду падыходаў да прафарыентацыйнай дзейнасці з боку факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, універсітэта.

У праграмным дакуменце ЮНЕСКА “Рэформа і развіццё вышэйшай адукацыі” (Парыж, 1995 г.) адзначаецца, што забеспячэнне якасці ведаў студэнтаў вышэйшай школы залежыць у асноўным ад іх здольнасцей і матывацыі, атрыманых пры заканчэнні школы. Таму неабходна звярнуцца да пытанняў сувязей вышэйшай і сярэдняй школы, кансультавання і арыентацыі навучэнцаў, а таксама выхавання ў студэнтаў павышанага пачуцця адказнасці перад грамадствам.

ВНУ павінны вызначыць змест, формы сваёй прафарыентацыйнай дзейнасці. Прычым прафарыентацыйную работу трэба праводзіць не разрозненымі мерапрыемствамі, даволі часта разавага характару, а ўключыцца ў сістэму вучэбна-прафарыентацыйнай і пазавучэбнай прафарыентацыйнай работы, выкарыстоўваючы патэнцыял існуючых суб’ектаў гарадскіх цэнтраў прафарыентацыйнай дзейнасці, цэнтраў па кансультаванні выпускнікоў пры выбары прафесій, СМІ і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры планаванні прафарыентацыйнай работы неабходна ўлічваць навуковыя распрацоўкі і арыентавацца на наступныя кампаненты, якія навукоўцы выдзяляюць пры сістэмным падыходзе да прафарыентацыйнай дзейнасці: фарміраванне прафесійнай самасвядомасці; прафесійнае самавызначэнне; забеспячэнне гуманізацыі вытворчасці. Трэба ўлічваць таксама і вынікі праводзімых сацыялагічных даследаванняў.

ВНУ, клапоцячыся аб падрыхтоўцы спецыялістаў, павінны весці інфармаванне аб прафесіях дыферэнцыравана, рыхтаваць матэрыялы ў дапамогу вучням, настаўнікам, школьным бібліятэкарам, бацькам, супрацоўнікам цэнтраў прафарыентацыйнай работы.

Неабходна больш актыўна выкарыстоўваць сродкі масавай інфармацыі, прычым такія праграмы тэлебачання і старонкі перыядычных выданняў, якія глядзяць і чытаюць менавіта вышэйазначаныя суб'екты, што спрыяюць прафесійнаму самавызначэнню школьнікаў, і самі школьнікі ў першую чаргу.

Сёння актуальнасць уяўляюць выкарыстанне магчымасцей сеткавых інфармацыйных тэхналогій, змяшчэнне інфармацыі аб бібліятэчнай прафесіі на сайты ўстаноў, якія інфармуюць школьнікаў аб разнастайных прафесіях, а таксама стварэнне ўласных інфармацыйных сайтаў аб факультэце, выпускніках, уключаючы і старонкі, мэтанакіравана падрыхтаваныя ў дапамогу будучым абітурыентам.

З мэтай пазбаўлення многіх жыхароў краіны ад даволі вузкага ўяўлення аб прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа, звязанага толькі з працэсам выдачы кніг, а галоўнае – у дапамогу прафесійнаму самавызначэнню асобы неабходна распрацоўка прафесіяграм бібліятэчных спецыялістаў з улікам іх спецыялізацый, выконваемых функцый, выкарыстання сродкаў (у тым ліку і тэхнічных, аўтаматызаваных сродкаў), новых тэхналагічных асаблівасцей ажыццяўлення разнастайных працэсаў бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, умоў працы, якія характэрныя для сучаснай прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа.

Не спрыяюць дакладнаму ўяўленню аб сучасным змесце прафесійнай дзейнасці бібліятэкара-біблієграфа і адсутнасць прафесінага адбору абітурыентаў пры паступленні ў ВНУ, нявызначанасць профільнай дысцыпліны пры здачы ўступных экзаменаў. Калі раней у якасці профільнага экзамену быў экзамен па літаратуры, то сёння сам характар дзейнасці, аднясенне бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства да такога кірунку, як інфармацыя і камунікацыі, робяць лагічным увядзенне профільнага экзамену па інфарматыцы, у той жа час абітурыенты здаюць экзамены па рускай (беларускай) мове, гісторыі Беларусі і экзамен па курсу "Чалавек. Грамадства. Дзяржава".

Педагагічна мэтазгодна ў большай ступені развіваць вучэбную дапрафесійную падрыхтоўку школьнікаў праз стварэнне ў школах бібліятэчных класаў, фарміраваць актыў школьных бібліятэк з ліку школьнікаў. Значны патэнцыял мае таксама функцыянаванне пры бібліятэках вучэбна-вытворчых камбінатаў, дзе бібліятэкары цэнтральных бібліятэк ЦБС на працягу двух гадоў выкладаюць для школьнікаў бібліятэказнаўчыя і бібліяграфазнаўчыя дысцыпліны, арганізуюць практычныя заняткі, выдаюць пасведчанні аб заканчэнні. Па сутнасці, адбываецца пачатковае навучанне бібліятэчнай прафесіі. На жаль, гэтым формам работы мала надаюць увагі прафесійныя навучальныя ўстановы: не абагульняецца вопыт іх дзейнасці, не аказваецца інфармацыйна-метадычная падтрымка. Можна было б пры залічэнні ў навучальныя ўстановы знайсці формы ўліку рэкамендацый бібліятэк выпускнікам вучэбна-вытворчых камбінатаў, таму што менавіта такі дапрафесійны вопыт і спрыяе выбару прафесіі, прафесійнаму самавызначэнню вучняў.

Да гэтай работы неабходна больш грунтоўна рыхтаваць бібліятэкараў школьных бібліятэк праз арганізаваныя формы навучання і сістэму павышэння кваліфікацыі. Дарэчы, у межах прапануемага курса "Бібліятэчная прафесіялогія" могуць выкладацца тэмы, звязаныя з пытаннямі прафарыентацыі ў бібліятэчнай сферы. Без інтэграцыі намаганняў адукацыйных устаноў і бібліятэк, менавіта тых, хто наглядна і штодзённа фарміруе імідж прафесіі і можа раскрыць перад школьнікамі не толькі яе знешні бок, немагчыма павысіць дзейснасць прафарыентацыйнай работы.

Эфектыўнасці працэсу фарміравання матывацыі моладзі да выбару прафесіі бібліятэкара ў сучасны момант спрыяе рэальная падтрымка з боку дзяржавы бібліятэчнай справы. Гэта ўплывае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на павышэнне інтарэсу і фарміраванне цікавасці да прафесіі бібліятэкара, што таксама неабходна ўлічваць і выкарыстоўваць пры прафарыентацыйнай рабоце.

Разглядаючы другую частку вызначанай праблемы – матывацыйную накіраванасць будучых бібліятэкараў на паслядыпломную адукацыю – трэба адзначыць некаторыя асаблівасці сучасных адукацыйных працэсаў. У наш час, акрамя гуманізацыі і гуманітарызацыі адукацыі, яе важнай якасцю становіцца фарміраванне ўстойлівай патрэбнасці ў аднаўленні ведаў, уменняў і навыкаў, гэта значыць патрэбнасці ў бесперапыннай адукацыі.

Справядлівае меркаванне, што ў канчатковым выніку адукацыя павінна стаць такім сацыяльным інстытутам, які быў бы здольны аказваць разнастайныя адукацыйныя паслугі, забяспечваючы шырокім масам магчымасць вучыцца бесперапынна, атрымліваць дадатковую адукацыю. Гэты працэс больш ці менш адэкватна адлюстроўваюць такія паняцці, як бесперапынная адукацыя, пастаяннае (пажыццёвае) навучанне, самаадукацыя, самастойнае набыццё ведаў і інш.

Акрамя таго, на сучасным этапе развіцця адукацыі адбываецца паступовая змена традыцыйнай (інфармацыйнай, “ведаўнай”) парадыгмы нетрадыцыйнай (асобасна арыентаванай), якая павінна ўключаць усё, што патрэбна чалавеку для развіцця ўласнай асобы. Гэта тычыцца як падрыхтоўкі ў ВНУ, так і пазауніверсітэцкай падрыхтоўкі.

Ва ўмовах рынкавай эканомікі пытанне аб прафесіяналізме кадраў не абмяжоўваецца, як раней, неабходнасцю пастаяннага ўдасканалення іх кваліфікацыі згодна займаемай пасадзе. Сёння размова ідзе аб неабходнасці і ўменні дзейнічаць у пастаянна зменлівым бібліятэчным асяроддзі, адаптацыі да новых прафесійных патрабаванняў, гэта значыць здольнасці бібліятэчнага работніка да ўнутрыпрафесійнай мабільнасці.

Як жа студэнты-выпускнікі адносяцца да неабходнасці бесперапыннага навучання?

Паводле адказаў 31% з іх плануюць працягваць навучанне пасля заканчэння ВНУ; 25% – адказалі катэгарычна “не”; 43% – не вызначыліся наогул.

На пытанне: “А якой Вы ўяўляеце сістэму бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі?” – 55% адказалі: “Не ведаю, не ўяўляю.” Ніводны чалавек не раскрыў поўна сістэму бібліятэчнай бесперапыннай адукацыі ў арганізацыйным плане, а 45% няпоўна, але называлі элементы сістэмы павышэння кваліфікацыі: семінары, стажыроўкі, канферэнцыі, міжнародны абмен студэнтамі, самаадукацыю.

На пытанне, што, з Вашага пункту гледжання, вымушае работнікаў бібліятэк займацца павышэннем кваліфікацыі, 58% указалі на неабходнасць атрымання новай інфармацыі, 28% – магчымасць абмену вопытам з калегамі, 1% – на неабходнасць інтэлектуальнага развіцця, магчымасць атрымаць больш высокі заработак, 18% лічаць, што работнікі бібліятэк павышаюць кваліфікацыю па загаду кіраўніцтва, 8% не далі адказу.

Асэнсаванне значнасці далейшага прафесійнага навучання звязана з асэнсаваннем сацыяльнай адказнасці прафесіі перад грамадствам. На яе фарміраванне павінны быць накіраваны ўся сістэма падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў, кадравая палітыка кіраўніцтва бібліятэкай, дзяржаўная палітыка ў галіне бібліятэчнай справы. Пазітыўная матывацыя на пастаяннае ўдасканаленне – гэта сведчанне развітых духоўных патрэбнасцей асобы. Вось чаму ўсё большую значнасць набываюць гуманітарныя аспекты адукацыі, пошук кірункаў удасканалення вучэбнай, навуковай, выхаваўчай работы са студэнтамі. Аб неабходнасці працягваць такія пошукі сведчаць наступныя даныя анкетавання студэнтаў, якія сведчаць і аб выніковасці работы на факультэце па фарміраванні прафесійнай накіраванасці ў студэнтаў. Адказваючы на пытанне: “Ці змяніліся Вашы адносіны за час вучобы да выбранай прафесіі?” – 33% студэнтаў зазначылі, што прафесія стала прываблівАць больш, палова апытаных адказалі, што адносіны да прафесіі не змяніліся, і толькі 5% указалі, што прафесія стала прываблівАць менш, 8% адзначылі, што адчуваюць поўнае расчараванне.

Важнае значэнне для асэнсавання сацыяльнай адказнасці маюць і матывацыя прафесійнай дзейнасці, магчымасць задавальнення у працэсе яе выканання як базавых фізіялагічных патрэбнасцей, патрэбнасцей у бяспецы, так і па- трэбнасцей больш высокіх узроўняў – у зносінах; у поспеху, павазе, прэстыжы; у самарэалізацыі. Людзей стымулюе думка аб дасягненні жаданай мэты. Няма ніводнай работы, якая б не мела станоўчых бакоў для таго, хто зацікаўлены ў яе выніку. Пабуджальнымі матывамі для чалавека з’яўляюцца пачуццё задаволенасці дасягнутым, прызнанне, сама работа, адказнасць. Чалавек хоча адчуваць гонар за сваю працу, яму патрэбна, каб яго асабістыя мэты супадалі з мэтамі арганізацыі. Ён імкнецца працаваць з людзьмі, якіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паважае і ў якіх можа вучыцца. Ен хоча стаць часткай групы, інтарэсы якой супадаюць з яго ўласнымі прафесійнымі інтарэсамі, мець разумныя магчымасці прафесійнага росту. Работнік спадзяецца на падтрымку і павышэнне па службе, уключаючы пераход на работу з большай адказнасцю. І калі сёння не заўжды кіраўнікі бібліятэк могуць забяспечыць задаволенасць умовамі службовай сітуацыі (заработак, абмежаванні ў павышэнні па службе і інш.), яны павінны кантраляваць і стымуляваць пазітыўныя фактары задаволенасці, звязаныя з выкананнем канкрэтных задач падначаленымі, адзначаць дасягненні, значнасць работы.

Вялікім пабуджальным матывам у дзейнасці бібліятэчных работнікаў з'яўляецца павага з боку карыстальнікаў, чытачоў бібліятэкі. У гэтых умовах імкненне да павышэння свайго прафесіяналізму, умацаванне матывацыі ў дзейнасці будуць садзейнічаць не толькі асэнсаванню сваёй сацыяльнай адказнасці, але і яе рэалізацыі на практыцы.

Бібліятэкарам неабходна асэнсаваць неабходнасць пастаяннага павышэння кваліфікацыі, але і адміністрацыйныя органы павінны стварыць умовы, вызначыць фактары, якія ўплываюць на значнасць павышэння прафесійнай культуры. Гэта трэба адлюстраваць у нарматыўных дакументах. Названыя пытанні павінны ўваходзіць як у стратэгічную праграму развіцця штата, так і ў аператыўную кадравую работу кіраўнікоў і метадычных службаў.

Зыходзячы з вышэйадзначанага, можна сцвярджаць, што ў ВНУ дзейнасць па ўдасканаленні адбору і падрыхтоўцы спецыялістаў патрэбна праводзіць з улікам дасягненняў псіхалогіі ў галіне матывацыі і сацыяльна-псіхалагічных установак асобы; змяніць стратэгію і тактыку прафарыентацыйнай работы; надаваць больш увагі выхаваўчым аспектам выкладання спецыяльных дысцыплін, увесці ў вучэбны план такую дысцыпліну, як “Бібліятэчная прафесіялогія”; змяніць арганізацыйна-эканамічны механізм выкарыстання кваліфікаваных творчых бібліятэчных кадраў на працоўных месцах (заработак, ацэнка і стымуляванне працы, увага да прафесійнага росту творчых спецыялістаў, адпаведнасць пасады кваліфікацыйнай характарыстыцы і ўзроўню адукацыі і інш.).


1. *Бабосов, Е.М.* Выпускник перед выбором пути: монография / Е.М.Бабосов, С.А.Шавель, С.В.Кузьмин. – Мн.: Нар. асвета, 1998. – 239 с.

2. *Жизненное* самоопределение учащихся Республики Беларусь: опыт социологического исследования / отв. науч. ред. А.И.Левко. – Мн.: Нац. ун-т образования, 1995. – 138 с.

3. *Кухарчук, А.М.* Профессиональное самоопределение учащихся / А.М.Кухарчук, А.Б.Ценципер. – Мн.: Нар. асвета, 1976 . – 128 с.

4. *Шавир, П.А.* Психология профессионального самоопределения в ранней юности / П.А.Шавир. – М.: Педагогика, 1981. – 96 с.

5. *Ильин, В.В.* Мотивация и мотивы / В.В.Ильин. – М., 1998. – 324 с.

6. *Терешин, В.И.* Абитуриент и библиотечная профессия / В.И.Терешин // Библиотеки СССР. – 1971. – Вып. 51. – С. 50–58.

7. *Столяров, Ю.Н.* Профессия библиотекаря. Почему ее выбирают / Ю.Н.Столяров // НТБ СССР. – 1977. – № 1. – С. 13–27.

8. *Терешин, В.И.* Реформа и вуз / В.И.Терешин // Библиотекарь. – 1989. – № 9. – С. 26–27.

9. *Сляднева, Н.А.* Информационно-управленческие профессии – выбор XXI века / Н.А.Сляднева, Т.В.Разенкова // Библиотековедение. – 2000. – № 2. – С. 12–17.

10. *Профориентация* в процессе профессионального самоопределения учащихся / А.М.Кухарчук [и др.]; Минск. гор. центр проф. ориентации молодежи. – Мн., 1998. – 166 с.

11. *Кавалевіч, М.С.* Выбар прафесіі: арыенціры і спосабы самавызначэння / М.С.Кавалевіч // Адукацыя і выхаванне. – 1999. – № 11. – С. 27–30.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ